**Компас**

# Па навейшых тэхналогіях

**Днямі бібліятэка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў прымала гасцей. Сюды прыехалі дырэктары абласных, гарадскіх і раённых бібліятэк Беларусі. Сёння ўзрастае патрэба ў кіраўніках новага тыпу для бібліятэк усіх формаў уласнасці: яны павінны ўмець кіраваць не толькі аб'ектамі, але і працэсамі, фарміраваць рынак бібліятэчных паслуг, бібліятэчных рэсурсаў, укараняць навейшыя інфармацыйныя тэхналогіі.**



Бібліятэка БДУКМ ладзіць Міжнародную школу дырэктараў ужо чатыры гады запар, таму па традыцыі і ў гэтым годзе прайшла чацвёртая Міжнародная школа дырэктараў публічных бібліятэк Беларусі пад назвай "Майстэрства кіравання сучаснай бібліятэкай". Сярод пытанняў, якія разглядаліся на занятках школы: "Публічная бібліятэка як культурны элемент", "Гэты абсалютна свабодны доступ", "Як змяняецца бібліятэка, калі змяняецца свет: архітэктура і дызайн бібліятэчных будынкаў і інтэр'ераў XXI стагоддзя" і інш.

Мэта школы дырэктараў — павышэнне прафесійнага ўзроўню кіруючых кадраў бібліятэк рэспублікі, навучэнне сучасным тэхналогіям кіравання, развіццё прафесійных міжнародных камунікацый. Госць школы — Матліна Слава Рыгораўна, вядомы бібліятэказнаўца, адказны рэдактар часопіса "Библиотечное дело" (г. Масква). Ёю быў прачытаны шэраг актуальных лекцый па бібліятэчнай справе.

Мерапрыемствы праходзілі ў выглядзе майстар-класаў, семінараў, практыкумаў, творчых семінараў-майстэрняў, лекцый-прэзентацый. Напрыканцы ў рамках школы прайшла творчая сустрэча з паэтам, галоўным рэдактарам радыёстанцыі "Беларусь" Навумам Гальпяровічам.

**Таіса ГУРКО,**
**вядучы метадыст**
**бібліятэкі БДУКМ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ